## І ЎСПЫХНУЛІ ПЕРШЫЯ ЛЯМПАЧКІ

«У 1922 годзе быў распрацаваны праект будаўніцтва гарадской цэнтральнай электрастанцыі. Месца для яе было выбрана на беразе Сожа (там, дзе цяпер размяшчаецца Гомельская ЦЭЦ).

10 чэрвеня 1922 года адбылася ўрачыстая закладка электрастанцыі. На правы бераг ракі Сож сабраліся амаль усе жыхары горада... У цэнтры будаўнічай пляцоўкі прывітальна развяваўся чырвоны флаг. 3 натоўпу ў ярка-чырвонай кашулі выйшаў Яфрэм Андрэевіч Аляксееў. Падыйшоў ён да флага, апусціўся на калені і, як бы даючы прысягу быць верным справе Леніна, пацалаваў палотнішча. Потым Яфрэм паклаў у траншэю некалькі цаглін. Удзельнікі мітынгу тут жа ўзнялі яго на рукі і пад гучныя воклічы «ура!» доўга падкідвалі ў паветра».